Цана асобнага нумару 20 гр.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

РЭХА ПРАЦЫ

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: Вільня, Віленская вул. 12—6 (Wileńska 12. m. 6) Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня, апрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.	Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 1 зл. 50 гр., на 3 мес. — 4 зл., на паўгоду — 8 зл., на год — 15 зл., загранічу ўдвая даражэй. Перамена адрэсу 30 гр.	Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукаван. залежыць ад Рэдакцыі.	Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 грош. за радок пэтыту ў 1 шпальту.

№ 4 — Вільня, Серада 12-га верасьня 1928 г. — Год 1

Мы хочам беларускай школы.

Ці патрэбна каму даказваць у нашы часы права кожнага народу мець сваю родную школу? Родная школа з матчынай мовай—першае трэбаваньне пэдагогікі (навукі аб навучаньні). Найлепшыя сьветачы гэтай навукі ставяць гэтае трэбаваньне ў васнову ўсяго навучаньня.

Для нас, беларускіх сялян і работнікаў, права роднай мовы ў школе мае яшчэ шырэйшае значэньне. Школа з чужой мовай ня толькі асымілюе (перарабляе ў іншы народ) — яна дзеліць наш народ на дзьве часткі—як кажуць у народзе—на рускіх і палякоў. А гэты падзел часта існуе навет у аднэй і той-жа сям'і.

Нацкоўваючы адну частку на другую, той, каму гэта патрэбна, адцягае ўвагу беларускіх працоўных ад іх супольнай барацьбы за сваё сацыяльнае вызваленьне. Родная мова і родная школа—гэта той цэмэнт, які злучае і спойвае ўсіх беларускіх працоўных у адно магутнае цэлае. Ня будзем закрывацца — ня гледзячы на сільны ўзрост, як сацыяльнай, гэтак і нацыянальнай сьвядомасьці беларускага селяніна і работніка, гэтая сьведамасьць не дайшла яшчэ да тога, каб зусім зацерці тую рэлігійна-культурную мяжу між дзьвюма часткамі народу, якую правяла сярод нас гісторыя. Ня толькі кулацкія і панскія галасы ўпалі на панскія сьпіскі пры выбарах, ня толькі „выбарнаю свабодаю" можна тлумачыць праход п. п. накшталт князя Радзівіла, або людажэра Мацкевіча ў Сойм з нашых абшараў,—да гэтага, бязумоўна, ня мала прычынілася і тая культурна-рэлігійная розьніца, якая ёсьць у нашым народзе і якая паглыбляецца чужой школай. Родная школа—відавочны факт нашай еднасьці, якую з лепшымі вынікамі можна пакіраваць на здабыцьцё іншых правоў.

Толькі трэба прыгледзецца навакола, колькі ёсьць несправядлівасьцяў у вадносінах да нас усіх—сялян і работнікаў, як на кожным шагу патрэбна наша еднасьць. А гэта еднасьць чужою школаю сьвядома нішчыцца, скіроўваецца на барацьбу паміж намі самымі.

Права на родную школу забясьпечана нам Рыскім і Вэрсальскім трактатамі, гэтае права дае нам самая канстытуцыя Польшчы, урэшце і пастановы Сойму абавязваюць да гэтага. Аднак—школы, як ня было, так і няма, бо *гэта ня ў інтарэсах польскай буржуазіі.* Трактаты, канстытуцыі, законы пішуцца, але не выпаўняюцца, яны, як відно, зьяўляюцца нікому непатрэбным кавалкам паперу. Як відно, *справы тут вырашаюць не законы, а барацьба між польскаю буржуазіяй і беларускімі сялянамі і работнікамі.* Нам ня хочуць даць школы! Проста, як на жарт—мы павінны тут стаць у абароне законаў, трактатаў і канстытуцыі, падпісаных самымі панамі. Праўда, *кожны закон зьяўляецца вынікам барацьбы між паасобнымі грамадзкімі групамі* і калі ён напісаны, то ня з ласкі, а пад націскам працоўных гушчаў, але раз ён напісаны, мусіць выпаўняцца! *Мы да гэтага павінны прымусіць тых, хто яго ня хоча выпаўняць!*

Мы добра сьведамы таго, што сумная практыка папярэдніх гадоў ставіць нас перад тым самым кітайскім мурам, якога мы не змаглі разьбіць. Мы ведаем, што ў некаторых вёсках падавалі дэкларацыі падрад некалькі гадоў, а выніку ніякага няма. Ведаем, што ўва многіх ужо апускаюцца рукі, зьяўляецца зьняверра ў магчымасьць дабіцца таго, што жадаем; шмат хто перанёс розныя „баданя"; ува многіх, як кажуць, страх стаіць у вачох перад новай акцыяй.

Дык ці спыняцца?

Ніколі! Цяжкасьць, з якою нам прыходзіцца здабываць родную школу, робіць яе ў нашых вочах яшчэ больш дарагою, справай нашай, калі так скажам, сялянска-работніцкай амбіцыі (гонару), справай, за якую якраз трэба ваяваць.

Няхай, з другога боку, і той „цывілізаваны" сьвет, аб добрай апініі якога так ходзіць нашым дабрадзеям, няхай і ён бачыць, як выпаўняюцца законы, якія так красамоўна сьведчаць перад імі аб „поўнай нацыянальнай свабодзе" і „законнасьці парадкаў" тут. Мы, сяляне і работнікі, ня так ужо зацікаўлены гэтай „апініяй", але наша ўпорнае дамаганьне мусіць раскрыць вочы ўсім.

Трэбуем, каб словы не разыходзіліся з дзелам! Напісаны законы—мусяць яны быць выпаўнены.

Усе на фронт барацьбы за родную школу!

Мы хочам беларускае школы, гэта наша агульна-людзкая справа, гэта справа—законная, ніякая там „вывругова", *мы павінны дабіцца толькі таго, што ўжо нам забясьпечвае закон*!

А ўпорным дамаганьнем мы гэтага даб'ёмся!

„Мірныя" зьезды і трактаты.

Дзякуючы паўстаньню СССР, імпэрыялісты ўсяго сьвету, страцілі вялізарны рынак збыту — адну шостую частку зямное кулі — рынак, з якога пры царскім панаваньні капіталісты мелі вялікую нажыву. Цяпер-жа пралетарыят СССР, маючы ў сваіх руках уладу, ня хоча закоўвацца ў ланцугі заграпічнага капіталу, і вялікім імпэрыялістычным гаспадарствам не хапае рынкаў збыту — галоўнай крыніцы існаваньня капіталізму, не хапае рынкаў, дзе-б яны з выгадай для свае кішэні маглі прадаваць „уласныя" прадукты. Капітал іх пачынае душыцца ў рамках унутранага рынку.

У сувязі з усім гэтым перад імпэрыялістычнымі дзяржавамі паўстала новае найважнейшае заданьне — барацьба з рэвалюцыйнымі імкненьнямі пралетарыяту сваіх дзяржаў, барацьба з антыімпэрыялістычным рухам каляніяльных народаў і ўрэшце самае галоўнае — барацьба з СССР, як прычынаю ўсяго гэтага.

Сусьветная буржуазія бачыць, аднак, што дзякуючы сьвядомасьці працоўных масаў, яна ў новай вайне ня выйграе. Што пралетарыят пасьпеў, каб даць належны адпор свайму ворагу. Для таго, каб масы пазбавіць гэтай сьвядомасьці і, такім чынам, забясьпечыць сваё панаваньне, капіталісты ўжываюць розных спосабаў.

Першы і самы пашыраны з іх — гэта тэрарыстычная барацьба з рэвалюцыйным рухам.

Аднак капіталісты хутка пераканаліся, што фізычна рэвалюцыйны рух перамагчы ня можна, што кожнае дзеяньне выклікае працідзеяньне, што чым большы тэрор з боку капіталістаў на працоўныя масы, тым больш разьвіваецца рэвалюцыйны рух працоўнага народу.

Патрэбен больш умелы і больш хітры падыход. Патрэбен абман.

Вось, тут і прыйшлі ім з дапамогаю розныя „сацыялістыя", як II Інтэрнацыянал. Гэта найлепшае іх аружжа ў атуманіваньні сялян і работнікаў. Гэтыя „сацыялістыя", як Пэпэсы, Сельсаюз і іншыя прыкрываючыся прыгожымі „радыкальнымі" фразамі ўсьцяж пераконваюць работніцкую клясу, што небясьпека новых імпэрыялістычных войнаў ужо зьнікла, а пагрозу новай вайны яны высьмейваюць як страшыдла, выдуманае праз камуністаў. Для „довады" таго, што вайна, запраўды не пагражае, яны паказваюць на „пакаёвыя" справы Лігі Народаў, на розныя „мірныя" трактаты паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі і т. п.

Аднак, гэта не закрывае вачэй працоўным на тое, што запраўды „робіцца" капіталістамі ў справе захаваньня міру.

Працоўныя масы ясна бачаць, што ў той час, калі ўвесь II Інтэрнацыянал і іншыя „таварышы" крычаць аб тым, што няма пагрозы імпэрыялістычнай вайны, што капіталізм „разьвіваецца нармальна"—у гэты самы час імпэрыялісты ўсяго сьвету вядуць шалёную падгатоўку да новай вайны. Пралетары ўсяго сьвету бачаць, што ў той час, калі капіталісты гуляюць у „разбраеньне", крычаць аб захаваньні „міру", падпісваючы „пакаёвы" трактат Кэллёга, склікаючы „міжпарляментарныя" вуніі, так называемыя „нацыянальныя" кангрэсы і т. п., служачыя нічым іншым, як падгатоўкай вайны з СССР, — адначасна з гэтым будуюцца новыя браняносцы, выдумваюцца новыя атручваючыя газы, зацьверджваюцца большыя часткі дзяржаўных бюджэтаў на надрыхтоўку вайны.

Працоўныя даюць сабе ясную справу з таго, што „довады" Пэпэсаў і іншых з II-га Інтэрнацыяналу, аб тым, што пагрозы вайны ня існуе—ёсьць нішто іншае, як атуманеньне працоўных масаў, як спосаб адцягнуць увагу сялян і работнікаў ад пагражаючай ім небясьпекі, урэшце, як ліцьцё вады на млын імпэрыялістычнае палітыкі, як сеяньне маны паміж працоўнымі ўсяго сьвету.

„Кутох моладзі".

У бліжэйшых наступных нумарох нашай газэты будзе адведзена месца для моладзі, пад загалоўкам „Кутот моладзі". Просім нашых маладых чытачоў з правінцыі быць карэспандэнтамі аб палажэньні і працы моладзі на мясцох.

Голас кітайскага пралетарыяту.

Хто не сачыў за падзеямі, якія разьвіваліся на далёкім Усходзе—ў Кітаю? Кожны, хто змагаецца за лепшае жыцьцё працоўных, за зваленьне капіталізму, за самавызначэньне нацыяў, зьвярнуў туды свае вочы і ў думках ці жаданьнях салідарызаваўся з кітайскімі працоўнымі масамі. Аднак, мэта працоўных кітайскіх мас яшчэ не дасягнута. Праўда, ёсьць „незалежная" Кітайская Дзяржава, якая дае магчымасьць кітайскай буржуазіі „незалежна" ад замежнай (японскай, англійскай і інш.) эксплёатаваць свой пралетарыят.

Сколькі каштавала гэтая („сельсаюзьніцкая" і „хадэцкая") „незалежнасьць", яскрава сьведчыць ліст Фэдэрацыі Усекітайскіх Прафэсіянальных Саюзаў — сапраўдны голас кітайскага пралетарыяту, які падаём з № 38 „Myśli".

„Фэдэрацыя Усекітайскіх Прафэсіянальных Саюзаў. Да працоўных усіх краёў!

Зварочваемся да вас, бо хочам вам паказаць нашае палажэньне.

Вы ўжо ведаеце, дарагія таварышы, што кітайскія работнікі, таксама як і ўсе працоўныя масы Кітаю, заўсёды павінны былі нясьці падвойнае ярмо, — ярмо свайй кітайскай буржуазіі і чужых імпэрыялістычных дзяржаў.

Проці гэтага ярма паўсталі 30 мая 1925 года шанхайскія работнікі, проці гэтага ярма была скіравана шасьцімесячная забастоўка ў Гонгконг і Кантоне, проці гэтага падвойнага ярма пайшлі супольным фронтам на паўночны паход. У імя гэтай барацьбы мы зложылі нязьлічаныя ахвяры. Спадзяваліся вызваленьня і арганізавалі нашыя прафэсіянальныя саюзы, памагалі сялянству закладаць сялянскія саюзы.

Праз 15 месяцаў рэкі Кітаю што раз то балей чырванелі ад крыві работнікаў і сялян.

Ці ведаеце, таварышы, што Чан-Кай-Шэк у Шанхаі і Лі Ті-Сін у Кантоне забілі ў красавіку пр. году зьверх 4000 работнікаў, хочучы „зрэарганізаваць" прафэсіянальныя саюзы, г. зн. разваліць іх, а пралетарыят выступіў проці гэтага? Ці ведаеце, таварышы, што пасьля забраньня Гуандуну ў красавіку забіта ў працягу $1/2$ году—2000 рабочых? Ці ведаеце, што ў Гонан і Гупэг расстрэлена 20,000 сялян толькі за тое, што не хацелі паміраць з голаду на сваіх маленькіх загонах зямлі і аддаваць жаўнерам апошнюю міску рысу?

Ці ведаеце, таварышы, якім дзікім спосабам здушана работніцкае паўстаньне ў Кантоне, скіраванае проці ярма мілітарыстычных катаў? Ці ведаеце, што больш як 5000 работніцкіх трупаў ляжала на вуліцах Кантоту, што зьвязвалі па 5 работніц разам і гэтак іх жыўцом палілі?

Ці ведаеце, што на рынку ў Кантоне, расстраляна 600 рікш-кулісаў,—гэтых — „людзей-коняў", якіх існаваньне можна прадставіць толькі ў так прыгнечаным поўкалёніяльным краі, як Кітай,—за тое, што схавалі чырвоныя какарды на памятку паўстаньня?

Ці ведаеце, таварышы, што ў Чап-шэ і Ганькоў, дзе паўстаньняў ня было, Бай-Гун-Чы ды іншыя гэнаралы расстралялі 4000 чалавек з той прычыны, што мелі мазольныя работніцкія рукі?

Ці ведаеце, што сам толькі Фэнг-Юг-Сіанг прыказаў сьцяць галавы 300 работнікам адной ткацкай хвабрыкі і панадзяваць іх на калы навокала хвабрыкі за дамаганьне падвышкі платаў, пры помачы забастоўкі?

Англійская, японская і амэрыканская ўлада лавіла рабочых і аддавала іх кітайскім катам. Ангельскія суды займаюцца таргоўляй галовамі нашых таварышоў. Амаль ня ўсе правадыры прафэсіянальнага руху пасаджаны за краты і выданы кітайскай буржуазіі. Ім усім сьцята галавы, а ангельскія ды японскія шпікі шмат атрымоўліваюць за галавы нашых правадыроў.

Але не хапае яшчэ гэтага катам кітайскага народу. Японцы адкрыта падымаюць на поўначы Кітаю аружную інтэрвэнцыю, захапілі Тсімане і Манджурыю, тымчасам, Ангельцы падымаюць скрытую інтэрвэнцыю ў Гуандуне. Чай-Кай-Шэк і рэшта гэнаралаў прадаліся імпэрыялістам і маўчаць. Усе скіроўваюць свае пашчы да даліны Янг-Тсэ і хочуць схапіцца да новай бойні аб падзел Кітаю.

Мала таго, што плыве кроў кітайскага народу, прыгатаўляецца новы страшэнны, яшчэ больш крывавы плян. У імя падзелу даходаў зброяцца дзяржавы да новай вайны ў Кітаі.

Дарагія тав. работнікі, не павінны вы пазволіць далей гуляць Кітаем, павінны жадаць спыненьня таргоўлі галовамі працоўных Кітаю, павінны жадаць забароны аддаваньня вязьняў кітайскім уладам, павінны жадаць выдаленьня ўсіх ваенных караблёў, і аружных сілаў з Кітаю, мусіце нам памагчы, бо гатуецца новая вайна ў Кітаі, павінны жадаць, каб ня ўмешваліся імпэрыялістычныя ўрады да ўнутраных спраў Кітаю.

Памажэце нам у нашай барацьбе проці небясьпекі новай сусьветнай вайны".

Вось, як здабыта „незалежнасьць" Кітаю.

П. Ж.

Ці ёсьць у Вашай вёсцы каапэратыў? Калі ён заложаны і да якога Саюзу належыць? Просім аб надасланьні у Рэдакцыю. Просім наагул пісаць аб каапэратыўных справах.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

СОЙМ.

Як даносіць варшаўская прэса (А.В.С.), Сойм Польскай Рэспублікі будзе скліканы 31-га кастрычніка гэтага году.

Рэха выбараў.

Прэса інфармуе, што ў хуткім часе Найвышэйшы Суд будзе разглядаць справу выбараў у Сойм у выбарнай акрузе Гнезьна. Спадзяюцца, што выбары ў гэтай акрузе будуць унясажнены.

Прычына разгляду справы, — быццам вынік выбараў „не адпавядае настроям мясцовага жыхарства і высока крыўдзячы вялікую частку грамадзян". А вынікі былі наступныя: на 5 мандатаў атрымалі: Правіца—1 ман., Блёк менш.—1 ман., Эндэкі—1 ман., і Блёк Пяста з Хрыс.-Дэм.—2 ман.

Аднаўленьне радава-польскіх перагавораў.

Паводле інфармацый польскай прэсы, 6 г. м. выехаў у Маскву польскі пасол у СССР Патэк.

Адначасна з Патэкам выехала ў СССР на кірмаш у Ніжнім-Ноўгарадзе дэлегацыя польскіх прамыслоўцаў. У склад яе ўваходзяць: князь Стан. Любамірскі, старшыня цэнтральнага саюзу промыслу, гандлю і фінансаў, дырэктар Скомпскі з „Полроса", дырэктар Слабаневіч, віцэ-старшыня радава-польскай гандлёвай палаты, дырэктар Эвэрт і іншыя.

Дэлегацыя гэтая, як піша прэса, мае даведацца ў Маскву і іншыя прамысловыя раёны.

„Голас Праўды" падае, што ў часе пабыту ў Маскве, гэтая дэлегацыя будзе весьці перагаворы аб радава-польскім гандлі.

5 г. м. ў Варшаву прыехалі з Масквы афіцыяльныя радавыя дэлегаты на Усходні Кірмаш у Львове — Штэйншапір і Гэттлер. Наступнага дня радавая дэлегацыя была пачаставана сьнеданьнем, наладжаным у яе чэсьць міністэрствам промыслу і гандлю, а так-жа і радава-польскай гандлёвай палатай.

З камуністычнага руху ў Польшчы.

У Львове, як інфармуе польская прэса, мясцовыя камуністы ладзілі дэманстрацыю. З прычыны выпадаючага „міжнароднага дня моладзі", у дэманстрацыі прымаў удзел і пас. Сойму Вальніцкі. Паліцыя зьліквідавала дэманстрацыю, адабрала чырвоныя сьцягі і плакаты і арыштавала 15 чалавек. У гэты дзень паліцыя ліквідавала тайнае камуністычнае паседжаньне ў памешканьні „Бунда".

У Пазнані так-жа была камуністычная дэманстрацыя ў чэсьць „міжнароднага дня моладзі". У дэманстрацыі, па славах прэсы, было прысутных 600 чалавек. Дэманстрацыя была ліквідавана паліцыяй. Арыштавана—6-х.

У Кліманцэ ў Дамброўскім вугальным басэйне паліцыя арыштавала, у сувязі з прыгатаваньнямі камуністаў да „міжнароднага дня моладзі"—16 асоб.

Правал сацыял-згоднікаў у вачох працоўных масаў.

Як паведамляе варшаўская прэса, 4-га г. м. адбыліся 2 вечы трамвайных работнікаў, на якія не забыліся зьявіцца і вядомыя сацыял-служкі ППС-ы. ППС-ы маніліся задэманстраваць перад работнікамі сваю помач у атрыманьні імі (работнікамі) 45 проц. месячай пэнсіі, як беззваротнай дапамогі.

Але гэтыя пэпэсаўскія надзеі скончыліся вельмі прыкра для іх, бо работнікі, добра ацаніўшы ролю пэпэсаў у гэтай акцыі, іх баламуцтва і здраду, змусілі іх пакінуць залю пад музыкай — пад сьвістам. Мейсца вытураных здраднікаў занялі прадстаўнікі прафсаюзу.

У часе дыскусіі была востра скрытыкавана здрадніцкая роля пэпэсаў і аднагалосна ўхвалена рэзалюцыя, асуджваючая ППС-аў за іх шкодніцкую для працоўных масаў акцыю і здраду сацыялізму.

Ці ня гэткая доля чакае шкоднікаў і здраднікаў інтарэсаў і беларускіх працоўных гушчаў!..

Арышт камуністаў.

У часе арыштаваньня 6 камсамольцаў у Клімэнтове (дамброўскі басэйн), падгатаўляўшыхся да „міжнароднага дня моладзі", паліцыя натрапіла на сьлед камуністычнай ячэйкі ў вёсцы Обойга.

Паміж арыштаванымі 10 камуністамі з в. Обойга знаходзіцца адна дзяўчына Кляра Кайзэр, якая быццам мелася чытаць рэфэраты ў часе камуністычнага тыдня.

Адзіночка і галадоўка.

Украінская прэса („Нове Життя" № 23) падае, што камуністычны пасол Бачынскі, выбраны пралетарыятам Дамброўскага басэйну, выданы Соймам, і які цяпер сядзіць у варшаўскай турме (на Павіяку) абвясьціў ад 16 мін. жніўня галадоўку.

Прычына галадоўкі — дзьвёх месячная „адзіночка", ці поўнае адасабленьне яго ад рэшты палітычных вязьняў.

І хто толькі не „дэфраўдуе".

Па апошнім весткам прэсы закончана сьледзтва ў справе вялізарных надужыцьцяў у Вывазовай Камісіі Міністэрства Промыслу і Гандлю. Суд пачнецца ў верасьні 1928 г. у Акружным Судзе ў Варшаве. Абвінавачваецца цэлы рад высокіх урадоўцаў Міністэрства Промыслу і Гандлю і купцоў.

Узрост даражыні

Статыстыка падае, што ў месяцы ліпні даражыня ўзрасла на 1,3 проц.

Абмен палітвязьнямі.

У другой палове г. м. маецца адбыцца, як паведамляе прэса, абмен палітычнымі вязьнямі паміж Польшчай і Літвой.

Вялізарны ўраган.

Апошнімі днямі ў Замойскім пав. прайшоў вялікі ўраган з навальніцамі і перунамі. Паламана 1850 дрэваў, разбураны 2 гумна, хлеў і хата.

Той-жа ночы прайшоў ураган і над Тамашоўскім пав. Паламана 1.200 дрэваў, зьнішчана каля 150 моргаў лесу, спалена 6 гаспадарак, разбурана 4 і адзін чалавек забіты.

Шкоды яшчэ не аблічаны.

Заграніцай.

У Менску пратэстуюць.

Працоўныя масы ў Радавай Беларусі зорка сачаць за падзеямі ў Зах. Беларусі.

Гэтак у зьвязку з завешаньнем Галоўнае Управы Т-ва Бел. Школы, у Менску, як піша „Słowo" № 205:

„Ува ўсіх газэтах паказаліся артыкулы, прысьвечаныя дзейнасьці гэтай (Т-ва Белар. Школы) камуністычнай (???) арганізацыі. Адначасна карыкатуры і весткі аб нібы-то цяжкім тэроры (!) у Віленшчыне. У аўторак 4 б. м. ува ўсім Менску былі скліканы пратэстацыйныя мітынгі. Рабочыя з дзяржаўных фабрык і жаўнеры былі звольненыя ад працы, каб запоўніць мітынгі як найбольшым лікам слухачоў. Прамоўцы, выступаючыя на сходах, паказвалі на факт закрыцьця арганізацыі, як на пачатак польскага наступленьня на цэласьць Беларусі і як варожы акт, скіраваны перш-на-перш проці Радавай Беларусі. Ведама, былі прыняты адпаведныя рэзалюцыі, ганьбячыя Польшчу і заклікаючыя да вайны (?) проці Польшчы і „да сусьветнай рэвалюцыі".

Варашылаў у Гомелі.

Як падае „Słowo" № 205, 4 г. м. у Гомель (Родавая Беларусь) прыехаў Варашылаў—старшыня Ваеннай Рэвалюцыйнай Рады, Камісар Арміі, найвышэйшы кіраўнік аружных сілаў СССР. На яго спатканьне выехаў кіраўнік беларускага ГПУ і старшыня Цэнтр. К-ту беларускага ўраду Чарвякоў. Мэта прыезду трымаецца ў сакрэце.

Культурны ўзрост СССР.

Як падае польская прэса, апошнімі часамі старшыня Маскоўскай Рады Уханаў унёс прапанову стварыць у Маскве „Парк адпачынку і культуры".

У гэтым парку маецца быць заложаны пад адкрытым небам музэй народаў СССР.

Такім чынам рабочыя насьля 7-мі-гадзіннай дзеннай працы будуць мець магчымасьць у гэтым парку адпачываць, а разам і разьвівацца культурна.

Дом зьездаў і кангрэсаў.

У Маскве паўстаў праект будовы „Дому Зьездаў", у якім будуць адбывацца ўсялякія зьезды і кангрэсы. Гэты дом мае быць найбольшым публічным маскоўскім гмахам.

Заля мае зьмяшчаць каля 10.000 асобаў, пры чым 7.000 мейсцаў будзе знаходзіцца на магутных бальконах.

Пры доме будуць існаваць уласны пачтова-тэлеграфічны адзел, інфармацыйнае бюро, рэстаўрацыя і г. д.

Бібліятэка пры „Доме Зьездаў" будзе налічваць каля 300.000 томаў розных кніжак.

Манэўры радавага флёту на Балтыцкім моры.

Рыжская прэса цьвердзіць, што ў марскіх манэўрах радавага флёту на Балтыцкім моры прымала ўчасьце 2 бранявосцы, 2 крэйсеры, 4 мінаносцы, 10 контр-мінаносцаў і 7 аэрапланаў.

Бэля-Кун — кіраўнік камуністычнай акцыі ў Заходняй Эўропе

Венскія газэты даведаліся з Масквы, быццам ведамы вэнгерскі камуніст Бэля-Кун назначаны Комінтэрнам кіраўніком усей камуністычнай акцыі ў Заходняй Эўропе.

Чычэрын выехаў заграніцу—на курацыю.

4-га верасьня выехаў з Масквы заграніцу Чычэрын, які мае адбыць 3-месячны лячэбны одпуск на заграпічным курорце. 5-га верасьня Чычэрына чакалі ў Бэрліне, дзе ён маніўся мець важныя палітычныя гутаркі.

Трактат Кэллёга падпіша радавы пасол у Парыжу.

Літвінаў даручыў радаваму паслу ў Парыжу Доўгалеўскаму надпісаць ад імя СССР Трактат Кэллёга. Сьпярша гэта хацеў зрабіць быццам асабіста сам Чычэрын, але, зразумела,—калі-б Рады былі запрошаны да надпісу Трактату, як яго першыя закладчыкі. Але фармальнасьць далучэньня да Трактату мог зрабіць і пасол.

Магчымасьці паразуменьня між СССР і Амэрыкай.

Французская прэса робіць сэнсацыйныя рэвэляцыі аб тым, быццам—у гутарцы Штрэзэмана з Брыянам у часе зьезду дыпляматаў у Парыж на падпісаньне Трактату Кэллёга—Штрэзэман нахіляў Брыяна, каб той—поруч з ім, Штрэзэманам,—запрапанаваў усім вялікім дзяржавам фінансаваньне гаспадарчага ўздыму СССР. Быццам Брыян адказаў адмоўна. Цяпер нямецкая прэса цьвердзіць, што ў ангельскіх урадавых колах пануе страшэнная трывога — з прычыны распачаўшагася збліжэньня паміж СССР і Амэрыкай. Быццам падпісаньне Радавым урадам Трактату Кэллёга зрабіла вельмі добрае ўражаньне ў Амэрыцы. У выніку гэтага амэрыканскія фінансісты—гатовы распачаць перагаворы ў справе шырокага крэдыту Радам. Гэтыя ангельскія страхі выкліканы адбыўшыміся перагаворамі паміж дэлегатамі амэрыканскіх прамысловых трэстаў і концэрнаў з прадстаўнікамі гаспадарчых кругоў СССР. Нямецкая прэса піша, што гэта гаспадарчае паразуменьне паміж Амэрыкай і Радамі адчыніла-б вялізарныя магчымасьці і для Нямеччыны, якая пэўна-ж выступіла-б у ролі фінансавага пасярэдніка...

Далейшыя мірныя здабычы Кантонскіх арміяў у Паўночным Кітаі.

Ня гледзячы на ўсе пагрозы Японіі, нацыянальныя арміі навет без вайны ўсьцяж заваёўваюць Паўночны Кітай, ахопліваючы Манчжурыю з усіх бакоў. Паўночныя войскі цэлымі вялізарнымі атрадамі — з японскім аружжам — пераходзяць масава на бок Кантону. Такім спосабам увесь гарнізон Тзін-Тао перайшоў на бок кантонскай арміі, аддаючы такім чынам усю правінцыю Шантунг ізноў у рукі нацыянальнага ўраду.

„Германія"—аб цярпеньнях украінскага народу.

Орган нямецкага „каталіцкага цэнтру" „Германія" зьмясьціў артыкул у справе украінскага пытаньня. Артыкул падае скаргі ўкраінцаў на ўціск з боку заборчых дзяржаваў, асабліва — Польшчы, дзе жыве каля 10 мільёнаў украінскага народу.

Літоўскі ўрад падпісаў Трактак Кэллёга, з засьцярогай адносна Вільні.

Вальдэмарас 7 верасьня загадаў літоўскаму паслу ў Парыжы падпісаць Трактат Кэллёга, зрабіўшы засьцярогу, што Літва не прызнае існуючай польска-літоўскай граніцы.

Аўстрыяцкі прэм'ер гутарыць у Жэнэве ў справе далучэньня Аўстрыі да Нямеччыны.

Амэрыканская прэса даносіць з Жэнэвы, што аўстрыяцкі прэм'ер, які асабіста стаў на чале дэлегацыі на Агульны Збор Лігі Нацыяў—у гутарцы з Брыянам—прасіў яго, каб ён падтрымаў імкненьне аўстрыяцкага народу да злучэньня з Нямеччынай. Быццам Брыян рашуча адмовіў, заявіўшы, што злучэньне з Нямеччынай было-б... самазабойствам для Аўстрыі, якому Францыя дапамагаць ня хоча. Брыян гуманна шкадуе жыцьцё Аўстрыі—больш, як яна сама...

Прэм'ер Зэйпэль меў даўжэйшую канфэрэнцыю і з канцлерам Мюллерам.

Маленькі фэльетон.

Уражаньні з „Паўночнага Кірмашу" ў Вільні.

Пратрубілі мне вушы польскія газэты:
— „Паўночная выстаўка на эўрапэйскі манер"!
— „Нязьлічаная колькасьць экспанатаў"!
— „Потэнга і доробэк Віленшчызны!"

І гэтак далей і далей...

Ня вытрамала маё сэрца,—дай, думаю, зайду.

Купіў білет за залатоўку і ўжо на выставе. Разглядаюся на баках: дзе-ж тут тая „потэнга" Віленшчыны?

Нешта ня відаць...

Аглядаю плугі, жніваркі, малатарні, арфоўкі, млыны...

Нічога Віленскага!—Вырабы чэхаславацкіх, ці нямецкіх фабрыкаў, або польскіх з Пазнані, Кутна і інш.

Іду далей. Аркестра „ржне" мазура, кракавяка, брыгаду. — У „шчэрапольскай" Вільні і музыка шчырапольская.

Пераходжу ў аддзел жывёлаў, які мяне найбольш цікавіць. Бачу коні, каровы, сьвіньні, а над імі вялізнымі літарамі, як бык, напісана:

Грабего Тышкевіча.

Князя Радзівілла.

І яшчэ з дзесяткаў два іншых грабяў і грабянятак.

Вось табе і канстытуцыя, думаю сабе, і 96 артыкул, які кажа, што: „Польская Рэспубліка не прызнае радавых і станавых прывілеяў, як роўна й ніякіх гэрбаў, радавых тытулаў і іншых"...

Яшчэ „бэбэхаўцы" канстытуцыі не зьмянілі, а тут тытулы, ды гэрбы разьвешаны! Адзін гэрб, дык вялізны, як дзьверы, вісіць,—нейкі сіні з зоркай і татарскім паўмесяцам. Дык вось у чым, думаю, „потэнга" Віленшчыны.

Агледзіў жывёлу, сабак, катоў, галубоў і... аж знудзіла мяне. Усё гэта—ясьневяльможных паноў з вялікіх двароў, або шляхтуноў з фальваркаў.

Дзе ж сялянскі статак? Дзе сялянскі дабрабыт?! Гэта-ж селянін—гаспадар Віленшчычы і Наваградчыны, чаму яго тут „потэнгі" няма?... Што за дзіва, што абшарнік мае добрага каня, ці карову,—гэта-ж тысячы мазольных рук працуе на яго, але што можа паказаць селянін?—хіба свае падаткі, вузенькія палоскі, заморания конікі і кароўкі.

Гэтай контр-„потэнгі" на выставе не паказваюць.

Заходжу ў „галоўны павільён". Колькі там рознага тавару! Буржуазія выставіла ўсё, што мела найлепшага ў сваіх крамах. Гэта—Рудніцкая і Нямецкая вуліцы выехалі з сваймі таварамі на дачу ў Бэрнардынскі сад. Але... амаль нічога тутэйшага тут няма. Дарагія заграпічныя матэр'ялы, шоўкі, пудры, парфумы, фартапьяны, раялі, радыёапараты, машынкі да пісаньня і інш., якія ў Віленшчыне і Наваградчыне, а навет... і ў Польшчы не вырабляюцца, а толькі заграніцай, дык, значыцца, і хваліцца няма чым.

Іду далей і бачу нешта тутэйшае, тыпічна польскае,—гэта варта ўвагі:

Рэстаўрацыя „Коло Полек". На верандзе сталы, у садзе сталы, а за сталамі, разумеецца, паны. Сядзяць на сонцы, аж парыжэлі, папацелі. Гарэлку, як ваду, жлокчуць, сапуць, ядуць, аж за вушамі трашчыць. Паслугачы, як аўтаматы, каля іх увіхаюцца і ўсё болей і болей падносяць.

Есьць на што паглядзець!—Відак праўдзіва рамантычна-шляхоцка-польскі, — як за „круля Саса". За тыя грошы, што тут прапьюцца можна было-б ня мала школаў, ці народных дамоў пабудаваць, некалькі сялянскіх гаспадарак на ногі паставіць.

Але:

„Што ўжыем, то для нас,—
„За сто лят не бэндзе нас", —

пяюць паны і стараюцца „ўжываць" чым хутчэй, бо баяцца, што часам, прароцтва гэтай песьні крыху інакш споўніцца і „не бэндзе нас" хутчэй наступіць...

Паглядзеў я на паноў і прыпомніў словы нашага песьняра:

„А што паны ядуць ласа
І што смагла могуць піць:
Ото соляць свaё мяса,
Бо ўжо сталі чыста гніць".

Адвярнуўся ад іх і пайшоў к выхаду. Гляджу налева вялікая брама, а на ёй надпіс: „Выстава Рэгіональна". Эгэ,—думаю сабе, тут недзе і „Спадар" са сваёй крамкай разлажыўся.

Заходжу.

Шукаю.

Няма „Спадара".

Аблазіў усе куты, а „Спадара" нідзе ня відна. Што за ліха,—думаю сабе, дзе-ж ён падзеўся?—павінен быў быць, а няма? Можа чары якія тут, ці што? Шчыпнуў сябе за лыдку,—усё ў парадку, — забалела; значыць я не зачараваны. Але дзе-ж „Спадар"?!

— Паночку,—пытаюся ў нейкага лысага пана, дзе тут „Спадар"?

— Не вем.

— То—такі пасол беларускі, — ён „спадарскі зьвяз" мае.

— Нема тут жадных бялорусінув, — то вшыстко польске,—гнеўна тлумачыць пан.

Стаю і скрабу сябе за вухам, аж раптам... „Спадар", самы натуральны, жывы „Спадар" мігнуў перад маім носам. Іду за ім. Бачу: невялічкая кватэрка-катух. На сьценках сялянскія вопраткі, спадніцы, пасьцілкі, рушнікі разьвешаны. А каля ўсяго гэтага прыгожы студэнт і нейкі невялічкі чалавечак увіхаюцца. Слухаю і аж вушам сваім ня веру: гутараць яны на мове „паньствовэй", — папанску рэжуць, як шляхтуны якія, а невялічкі чалавечак яшчэ неяк па чэску зацягвае. Мотошна стала слухаць, як беларусы родную мову ламаюць. Іду да дзьвярэй. Гляджу аж над дзьвярамі надпіс:

„Беларускі гаспадарскі зьвяз".

— Халуі!—думаю сабе, вы стыдаецеся свае беларускасьці,—вы са страху перад сваімі хлебадаўцамі, сваю беларускую вывеску пастыдаліся на калідоры, на відным мейсцы павесіць, а схавалі яе туды, дзе вока людзкое ледзь дагледзіць можа.

— Гэта—таксама, успомніў я, як казаў Пілсудскі ў Вільні, што легіёны насілі аўстрыяцкія значкі на заднім месцы (на якім садзіцца трэба),—так і „Спадар" павесіў сваю вывеску на.. заднім месцы...

Бедныя сяляне і сялянкі! каб Вы ведалі, што „Спадар" Вашу працу гэтак паняверыць будзе, што на Вашым працоўным мазалі будзе будаваць сваю нягодную кар'еру, Вы ніколі яму сваіх вырабаў не прысылалі-б!

Выйшаў на двор. Плюнуў са злосьці і пабрыў сумна да дому.

Ня весела стала мне на душы. Іду і думаю:

— Бедныя беларускія сяляне,—хто над імі ня зьдзекаваўся, а тут яшчэ і „Спадар" зьдзекавацца захацеў!...

Янка Барыс-Баркоўскі.

„Дзівосы і сьмяхоты" у Варшаўскім унівэрсытэце!

Ходаў, ходаў, пераходаў
У прафэсары папаў!
З матываў „Маланкі".

(Фэльетон).

Скачэце цешцеся, беларусы!!! Чаму цешыцца? Ды як-жа-ж не! Тут проста хоць ты ашалей ад радасьці! Жартачкі, гэтакае

Рэзультаты „гутаркі“ канцлера Мюллера з Брыянам у Жэнэве.

Нямецкая прэса з гарачым інтарэсам абгаварвае першую гутарку канцлера Мюллера з Брыянам у Жэнэве—у справе скасаваньня акупацыі. Дэмакратычная прэса сьцьвярджае, што гутарка гэта значна пасунула справу, хаця дадае, што ад агульнай прынцыповай гутаркі да канкрэтных перагавораў — яшчэ вялікі крок. Нацыяналістычная прэса, наадварот—сумна глядзіць на рэзультаты гутаркі, падчыркваючы заяву Брыяна журналістам, які назваў спатканьне сваё з нямецкім канцлерам „не нэгацыяцыяй, але конвэрсацыяй“, гэта значыць — ня „дзелам“, але проста „гутаркай“...

Сацыялістычная прэса слушна падчырквае, што адзіным, але важным, рэзультатам гутаркі было тое, што абедзьве староны ясна і точна фармулявалі (азначалі) свае дамаганьні. З аднаго боку Нямеччына дакладна адзначыла маральныя і палітычныя доводы за скасаваньне акупацыі; Францыя, з другога боку, пералічыла ўсе тыя кампэнсацыі (заплату), якія яна хоча атрымаць ад Нямеччыны за перадчасную эвакуацыю Надрэніі. Орган нямецкіх сацыялістаў („Форвэртс“) падчырквае, што францускія дамаганьні датычылі толькі фінансавай кампэнсацыі, але ніякіх палітычных кампэнсацыяў — у родзе „Усходняга Лёкарно“ ці дадаткавых гарантыяў бясьпечнасьці, або адмовы ад злучэньня з Аўстрыяй — Францыя ад Нямеччыны больш ня трэбуе.

Усе гэтыя палітычныя мамэнты цалком ухілены з дыскусіі.

У сваёй заяве журналістам Брыян, па між іншым, сказаў, што ня лічыць гутаркі з Мюллерам „негоцыяцыяй“ дзеля таго, што справа эвакуацыі — ня выключна француска-нямецкая, але—агульна-саюзьніцкая. Дзеля таго „нэгацыяцыя“ распачнецца толькі пасьля таго, як ён паразумеецца з англійскім, італьянскім і бэльгійскім урадамі. Але ў жэнэўскіх палітычных колах лічаць, перагаворы („нэгацыяцыю“) ў справе акупацыі ўжо распачатымі і спадзяюцца, што ў рэзультаце гутаркі з Мюллерам безадкладна адбудуцца такія ж гутаркі Мюллера з старшынамі англійскай, італьянскай і бэльгійскай дэлегацыяў.

„Сардэчнае паразуменьне“ Англіі з Францыяй—на целе Нямеччыны.

Нямецкія газэты з абурэньнем даносяць—аб распачаўшыхся ў Надрэніі манэўрах англа-францускай акупацыйнай арміі. У манэўрах прымае ўчасьце, паміж іншым, і полк ірляндзкіх гусараў. Венская прэса ў свой час даносіла, што супольныя манэўры ў Надрэніі маюць заманіфэставаць асабліва „сэрдэчвае паразуменьне“ паміж Англіяй і Францыяй—у зьвязку з падпісанай ўмовай—аб узаемным падтрыманьні на сушы і на моры.

Харваты адмовіліся ад высылкі асобнай дэлегацыі ў Жэнэву.

На апошнім паседжаньні галоўнай управы сялянска-дэмакратычнай коаліцыі, яе павадыры адмовіліся ад думкі — паслаць у Жэнэву асобную дэлегацыю — для абароны харвацкай справы. Было сцьверджана, што такая акцыя зьявілася-б выразным няпрызнаньнем супольнай дзяржаўнасьці — распачацьцем самастойнай заграпічнай палітыкі,—была-б незаконнай і проці-дзяржаўнай. Пастанову гэтую разглядаюць у Бэлградзе, як крок да шуканьня камправісу з боку Загрэба.

Адстаўка баўгарскага габінэту.

Сэнсацыю выклікала адстаўка габінэту Ляпчэва, які — поруч з мін. загран. спраў Буравым—спрабаваў прафарсаваць дамаганьне Англіі і Францыі ў напрамку разгрому Македонскай Арганізацыі. Справа аказалася залішне злажанай і цяжкай. На дамаганьне з боку мін. загр. спраў Бурава адстаўкі ваеннага мін. Воўкава, зараз-жа падалі ў адстаўку і іншыя міністры — у знак пратэсту. Гэта—побач з апорам з боку караля—рашыла лёс габінэту. Ляпчэў — ад імя ўсяго ўраду — злажыў уладу. Адстаўка баўгарскага ўраду лічыцца паражэньнем Англіі і Францыі ў Баўгарыі. Дзеля таго гэты факт выклікаў вялікі непакой у Парыжу і Лёндане. Адстаўка ўраду Ляпчэва, з другога боку, разглядаецца ў Баўгарыі і заграніцай, як перамога македонскай арганізацыі, якая мае вялізарную сілу ў краі. Асабліва вялікае ўражаньне адстаўка Ляпчэва зрабіла ў Югаславіі і Грэцыі.

Далейшыя забурэньні ў Баўгарыі ў зьвязку са справай Македонскай арганізацыі.

У апошнія дні палітычнае палажэньне ў Баўгарыі значна пагоршылася. У справу ўрадавага крызісу актыўна ўмяшаўся парлямант. 72 паслы дэмакратычнай партыі апублікавалі адозву, у якой заяўляюць, што выйдуць са складу ўрадавай большасьці ў парляманьце, калі ў новы габінэт ня ўвойдзе той-жа ген. Воўкаў ваенным міністрам. Такім чынам урадавая большасьць падзялілася надвое: большасьць—проці ген. Воўкава, меншасьць, але значная, за яго. За Воўкава стаіць магутная ваенная партыя, вельмі блізкая да караля. Але кароль, — баючыся націску Англіі і Францыі, — пачаў хістацца. Сам ген. Воўкаў, чуючы за сабой падтрыманьне шырокіх масаў народу і караля, заявіў у органе лібэралаў „Незалежнасьць“, што ён лічыць сябе патрэбным для краю, але цалком падпарадкуецца загадам караля.

Вэнгрыя прызнала альбанскага караля.

Вэнгерскі ўрад заявіў альбанскаму паслу ў Будапэшце, што Вэнгрыя прызнае Альбанскае каралеўства і ў хуткім часе мае выканаць усе патрэбныя фармальнасьці афіцыяльнага прызнаньня.

Наша хроніка.

„Саблагаізволілі“ адпячатаваць. Віленскі ваявода, як падае „Кур‘ер Віленскі“, на інтэрвэнцыю беларускае дэлегацыі ў справе „завяшэньня“ працы Галоўнай Управы Таварыства Беларускае Школы і апячатаньня памяшчэньня Т-ва згадзіўся на гэты раз загад Віленскага Гродзкага Старасты аб „завяшэньні“ ўхіліць, адначасна засьцерагаючы, каб надалей у Т-ве не праводзілася палітычная акцыя(???) і не дапусьціць да працы ў Т-ве непажаданых польскай уладзе асобаў(?).

„Рэха Грамады“. Гэтымі днямі ўсім вязьням, засуджаным у вядомым працэсе „Грамады“ будуць даручаны матывы (прычыны) прыгавару.

Гэтыя „матывы“ займаюць аж 40 старонак друку.

Ад часу даручэньня кожны з засуджаных будзе мець двухтыднёвы тэрмін на падачу апэляцыі. Апэляцыя, па заканчэньні ўсіх фармальнасьцяў, паступіць у Апэляцыйны Суд не раней канца кастрычніка, а будзе разглядацца не раней сакавіка 1929 г.

Рэха выбараў. Надовячы Міравы Суд у Горадні разглядаў справу функцыянераў Б.Б. у Горадні—Яна Шурпы, Рамуальда Данільчука і Леонарда Яроша, якія абвінавачваліся рэдактарам „Nowe Życie“ кс. Саванеўскім у надрукаваньні ў жыдоўскай часопісі „Унзэр Гроднэр Экспрэс“ лжывага лісту, закідаючага кс. Саванеўскаму разьбіцьце веча блёку нац. меншасьцяў у жыдоўскай школе ў Горадні, з мэтай скампраматаваньня Б. Б.

На судзе ўсталена, што веча разьбіта па загаду Шурпы і што „разьбівачы“ былі падгавораны Шурпай напісаць пісьмо, прыпісваючае гэтую акцыю кс. Саванеўскаму. Суд прыгаварыў Шурпу на 1 месяц турмы, а Данільчука і Яроша на 2 тыдні.

Трэба адзначыць, што Самога Шурпы на судзе ня было, бо ён „бавіўся“ на дажынкавых урачыстасьцях у Спале, быццам кіраўнік беларускай(?!) трупы з Гарадзеншчыны.

1 „Сялянская Ніва“ ня будзе больш муціць галавы сялянам. Усьлед за „Беларускім Словам“ Паўлюкевіча і яшчэ паўжывым „Беларускім Днём“ Ф. Умястоўскага прышла пара на сканаьне і органу нашых угадоўцаў—сельсаюзьнікаў. Па словах „Kurjera Wileńskiego“, газэта перастае выхадзіць з браку матар‘яльных засобаў, навет частка якіх ня можа быць пакрыта з прадажы газэты. „Dziennik Wileński“ падае, што газэта перастала выхадзіць „wobec wzrastającego zmniejszenia się listy czytelników“, значыць з браку чытачоў. Бязумоўна-ж, нашы сяляне ўжо зусім перасталі цікавіцца гэтай газэтай, якая часамі муціла ім галавы.

Ці праўда, ці не — „Dziennik“ падае, што ў незабаве з тае-ж самае прычыны мае перастаць выхадзіць і другі орган „radykałów“, панашаму — хадэкаў: „Biełaruskaja Krynica“. Думаем, што да гэтага ўсё-ж ня дойдзе.

Цікава, тая-ж газэта падае, што „пазасталая прэса беларуская(?) што раз часьцей б‘е на алярм, заклікаючы „братоў-беларусаў“ да падтрыманьня газэт“, што, па словах „Dziennika“, сьведчыць аб зьменшаньні ўплываў гэтых газэтаў.

Пішучы аб „Рэху Працы“, „Dziennik“ выдзяляе яе з пункту гледжаньня распаўсюджаньня. Эндэцкая газэта прычыну гэтага бачыць, што б. грамадаўцам не патрэбна турбавацца аб платных падпішчыках, а рассылаюць газэту дарма.

Гэта — наглая мана людажэрскіх эндэкаў. Наша газэта разьвіваецца іменна таму, што яе сяляне і работнікі лічаць сваей газэтай і што яна адна з беларускіх газэт мае ў шырокіх масах вялікую папулярнасьць. Гэтым, п. Обсьце, нас ня ўкусіце!

Мусім сказаць, што „Dziennik“ залічае да беларускай прэсы польскія газэты на беларускай мове, кажучы, што зьмяншаецца ў іх лік чытачоў. Мы лічым, што гэта — польская прэса, чуць не ўрадавая („Народ“, „Грамадзянін“ і „Бел. Дзень“). Што ў іх няма чытачоў — зусім зразумела, бо ім трэба было-б пісаць папольску — тады можа нашлі-б лепшы поспех.

„Беларуская Зарніца“. На гэтых днях вышла з друку новая часопісь „Беларуская Зарніца“ — царкоўна-народны двутыднёвік, орган праваслаўных беларусаў пад рэдакцыяй... А. Каўша. У заклiку „да паважаных Айцоў Настаяцеляў прыходу, усяго пачэснага духавенства і паважанага грамадзянства“ зразу-ж падаецца да ведама, што „гэта не ад каго не залежны орган“, чым зразу сябе новы орган выдае з галавой. Як быццым хто настойвае, што новы орган „залежны“? Зьмест сьведчыць аб нараджаньні новай хадэцыі — праваслаўнай (хоць ужо ёсьць на гэта і руска-беларуская група сэн. В. Багдановіча). Кароценькі зьмест— **Ад Рэдакцыі**, дзе паведамляецца, што выдаўцы „маюць на мэце даць магчымасьць сказаць праўдзівае слова аб царкоўных патрэбах і іх задаваленьні каранному (пры чым тут — каранному? Рэд.) мяйсцоваму беларускаму народу, бясшумна ў вяковай глушы захоўваючаму праваслаўную веру (папалі пальцам у неба Рэд.) і тым мучанікам(?!) духоўнікам, якія, мучаючыся горам і бедамі сваіх прыхаджан(??!), на сябе працярпелі ўвесь цяжар сучаснага царкоўнага быту і бяспраўя“. Вось, якраз гэтага і не хапала ў нас. Запраўды, якія дабрадзеі выдаўцы „Б. З.“! Далейшы зьмест — „**Беларусізацыя праваслаўнай царквы**“, „**Царства Божае і царства кесара**“, „**Пастанова Сьв. Сыноду Праваслаўнай Мітраполіі ў Польшчы**“, „**Думкі проціў небясьпечнага бязьвер‘я**“ (гэта ўжо гвозд!), „**Узаемаадносіны духавенства і прыхаджан**“, „**Мітрапалітальная Рада**“ і г. д. „Благодать“ проста. Вось табе і былы грамадавец(?) А. Коўш!

Часопісь, між іншым, паведамляе, што „з 22 на 24 жніўня г. г. адбылася ў Варшаве другая сэсія Мітрапалітальнае Рады пры Главе(?) Праваслаўнае Царквы ў Польшчы Мітрапаліце Дзіанісіі“ і што папярэдні склад Рады папоўнены... „ад беларускага грамадзянства... сьв. А. Коўш. Далей ідуць прозьвішчы, якіх не ўспамінаем, а то баімся, што папера пачырванее.

Да чаго-ж мы дажыліся?

Закрыцьце Радашкоўскае Беларускае Гімназіі? Згодна атрыманых вестак, нібы па загаду Маладэчанскага Старасты Радашкоўская Беларуская Гімназія закрыта ў той час, як усе вучні сабраліся і пачаты ў Гімназіі заняткі. Прычыны — „небясьпека публічнага спакою“(?).

Таварыства Радашкаўскае Беларускае Школы робіць захады перад адпаведнымі польскімі ўладамі аб адхіленьні беспадстаўнага гэтага загаду. Пачакаем падцьверджаньня весткі.

„Працуюць“. Беларуская Хадэцыя, адыгрываючы ролю вернай служкі польскага фашызму, не пакідае праз увесь час свайго існаваньня затуманіваць вочы беларускім працоўным масам перад запраўднасьцю і гэтым самым дапамагаць капіталу душыць сялянска-работніцкі рух.

У № 42 хадэцкай „Biełaruskaj Krynicy“ ў перадавіцы Аль. Стэповіча „Каля зьмены канстытуцыі“, аўтар яе, выказваючыся спачатку „варожа“ да зьмены канстктуцыі, у канцы, між іншым, дадае:

„Але, трэба думаць, прыдзе час, што Польшча ад шовіністычнага чаду ў значнай меры вылечыцца. Калі яшчэ ўзяць пад увагу тое, што пры нармальных выбарах прадстаўніцтва народаў ня польскіх у варшаўскім Сойме значна павялічыцца, то стане ясным, што не праведзеная у жыцьцё канстытуцыя 17-III магла-б і нам, Беларусам, даць большую гарантыю на разьвіцьцё нашай нацыі і паглыбеньне дэмакратызму, чымся загадковая праектаваная канстытуцыя“.

Ці гэта проста наіўнасьць аўтара? Ці ён яшчэ спадзяецца гэтым адурманіць масы! Ці ён ня ведае, што беларускі працоўны народ ужо даўно вылячыўся ад парлямантарнага чаду і парляманту даў справядлівую ацэнку. Гісторыя парлямантарызму паказала, што пры капіталістычным гаспадарстве „народнае прадстаўніцтва“ служыць толькі інтарэсам капіталу. Працоўным-жа даць яно палепшаньня жыцьця ня зможа. Сяляне і работнікі здабудуць яго толькі праз сталае і ўпартае змаганьне з капіталістамі і абшарнікамі за свае ідэалы.

Канец „Прасьветы“. З мэтай адцягненьня працоўных беларускіх гушчаў ад барацьбы за сваё нацыянальнае, а перадусім

дабрадзейства нечакана — неспадзявана, як той гром з яснага неба, звалілася на нашы галавы! Дай бог здаровейка нашым рэгіяналістам, бо-ж напэўна іхнія рэзалюцыі навялі, каго трэба, на гэту думку, на гэты „новы курс“ адносна да беларусаў! Чулі? Кафэдру-ж беларусазнаўства пры... Варшаўскім унівэрсытэце адчынілі!

— Пры Варшаўскім?! — зьдзівіцеся— а чаму ня пры тутэйшым, Віленскім?—

А нашто пры Віленскім, каб хто спытаў? Для беларусаў, для тутэйшых студэнтаў? Эт, гэта беларусазнаўства зусім для іх непатрэбная навука, напрасна толькі будуць час траціць! Думаеце, скончыўшы яго, атрымалі-б службу, зрабіўся-б каторы доктарам, адвакатам, або вучыцелем у сваёй староньцы? Дудкі! Заплакаўшы паедуць у Пазнань, або „Велькапольску“. — Чаму так?—Ды так, бачыце, нейк нашай інтэлігенцыі ня ручыць у сваім краі: ходзяць, аббіваюць парогі розных „ужэндаў“, куратараў, просяцца і ніяк ня могуць знайсьці сабе працы, хіба згодзяцца ехаць па вышэй сказанаму адрасу, а там ужо, ведама, беларусазнаўства зусім не патрэбнае. Дык зачым тут адчыняць нейкія беларускія кафэдры? Вось у Варшаўскім, дык зусім іншая рэч! Там, бачыце, як піша спадар у „воргане“, — выкладаньне беларускай мовы ў гэтым унівэрсытэце важна асабліва дзеля таго, што ў Варшаўскім унівэрсытэце ёсьць праваслаўны беларускі факультэт (вучыцца на ім каля 200 чал.), студэнты каторыя, скончыўшы, будуць пастырамі (папамі) у Зах. Беларусі. — Вось якая вялікая там робіцца справа! Дзеля чаго ж нам вучыць сваіх дзяцей, братоў, калі сюды нашлюць гатовенькіх адукаваных па ўсіх правілах „заходняе культуры“ папоў, ксяндзоў і ўсялякіх іншых з самае Варшавы.

Дык што-ж гэта такое? Знача і надалей будзе тасавацца эндэцкая палітыка палянізацыі Крэсаў? Знача нічога не зьмянілася і ня думае зьмяніцца?

А дзе-ж тыя абяцанкі „санатараў“ пра „новы курс“, пра культурна-гаспадарчую аўтаномію, пра беларускія гімназіі, розныя школы, асьвету, якімі шчодра сыпалі „бэбэхоўцы“ падчас і пасьля выбараў у Сойм? Дзеля чаго і каго нядаўна была ўхвалена рэгіяналістамі такая прыхільная і многа абяцаючая рэзалюцыя, што аж нашы „Спадары“ ды Пранукі пеніліся ад радасьці, пішучы ў сваіх газэтах. — Нарэшце польскае грамадзянства зразумела нашы патрэбы і йдзе нам на спатканьне!?— пасыплюцца напэўна ад вас запытаньні. Цацанка-абяцанка, а дурню дык і радасьць — кажа народная прыказка. А вам як хацелася-б, каб, знача, бяз ніякага нічога, чыркнуў пяром якісь там міністар і аграбай школы, зямлю, унівэрсытэты? Мо‘ зусім не хацелі-б знаць гэтых „культурнікаў“ і „сьветачаў“ з Варшавы, мо‘, скажаце, хай нашы нас і вучаць? Байкі! Ласы кот на мяса, ды гаспадар, каб на яго ліха, не пазваляе, за адну толькі спробу і то цэліць палкай па хвасьце зьехаць!

Мала што чаго хацелася-б, дык вам ужо зараз вось і на! Пачакайце гадкоў са 200-ці, навучыцеся раней польскай, больш дэлікатнай, мовы, пабывайце ў „кулках“, „стшэльцах“, „домах людовых“, прайдзеце, так сказаць, праз агонь і медныя трубы, раздумайцеся, дык можа тады і самі не захочаце сваёй гэтай прастаты—беларушчыны! А цяпер... цяпер пакуль што досьць вам будзе і абяцанак, досьць таго, што „Кур‘ер Віленскі“ зьмесьціць спагадны артыкульчык, цешцеся, што паны хоць прынамсь гавораць аб беларусах ды дзякуйце, што пазваляюць свабодна думаць аб гэтых „мігдалах“! Самі-ж добра ведаеце, што мары саладзейшыя за ўсё рэальнае, ужо здабытае.

А ці ведаеце, хто запрошаны (а мо‘ сам папрасіўся?) у „прафэсары“ на гэты беларускі факультэт у Варшаву? Не падумайце, што якая небудзь шыш — варона! Ого-го, брат, сам „спадар“ Заходняе Беларусі, Янка Станаўкевіч мае гонар быць запрошаны на гэтае пачэснае становішча!

Пайшоў у гару без драбіны наш Станаўкевіч, гэта ўжо не са „зьвязамі“ нейкімі на Вільні „хадацце“ — справа чысьцейшая! Цяпер „пану“ Станаўкевічу дык і шастом галавы не дастанеш — жартачкі гэтулькі тытулаў ды абавязкаў чалавек на сабе возіць: ён і доктар, ён і пасол „заканадаўкі“ (дзікі), ён-жа і сьвежа сьпечаны „прафэсар“ і не ў якой небудзь там табе Вільні, або Лодзі, а ў самай сталіцы „панства“— Варшаве! Вось каму жыць-пажываць, ды добра нажываць! Ня так, як нам грэшным — молімся толькі, каб бог даў як небудзь Лукішкі мінаваць, а ўжо аб чынах дык і ня думаеш і ў-ва сьне ня бачыш! Эх-хэ хэ! што, чалавеча, парадзіш, відаць ужо так на нашу долю выпала, мусіць пад такой нешчасьлівай зоркай мы радзіліся!

Але трафны ўсё-ж такі выбар зрабілі — доктар — філялёг, прафэсар хоць куды! Ён табе, як жарне лекцыю „беларусаведы“, як „заходаецца“ каля Варшаўскіх студэнтаў, як адчыне сваю „гаварылку“, забыўшыся навет пра „заканадаўку“, дык тыя, калі не палопаюцца са сьмеху, адразу ўцямяць усе „дзівосы і сьмяхоты“, якія зрабіў Янук з беларускае мовы. У момант даведаюцца, як гаварылі беларусы 300 гадоў таму назад яшчэ ў 16-м — 17-м стагодзьдзі, ня будзе для іх патрэбным прыяжджаць аж у Віленскі Беларускі Музэй і порпацца з гэтай мэтай па старадаўніх рукапісах — жыўцом пяроймуць ад свайго „прафэсара“. Толькі ня зусім вось трафна назвалі гэтыя лекцыі — „Беларускае мовы“, уласьцівей было даць ім назву „Сярэднявечнае Беларускае мовы“, але што-ж ты з уладай зробіш, каго захацелі, таго і пазвалі, як захацелі так і назвалі — трудная рада, браты!

А мо‘ тут крыецца адумысная мэта, каб з лекцыяў беларусазнаўства зрабіць „дзівосы і сьмяхоты“, пацешыць сваіх студэнтаў, каб, знача, зразумелі ўсю „пекнасьць“ беларускае мовы і набраліся-б патрэбнага духу і пашаны да ўсяго беларускага, чым так адзначаюцца ўсе сучасныя „кшэвіцелі осьвяты на Крэсах“?

А мо‘ думаюць, што калі ён сам прыемны, патульненькі і ўслужлівы чалавечак, дык і яго „славесы“ маюць быць прыгожымі і „ляяльнымі“? — Хто іх ведае іхнія думкі, тут, як кажуць, ня выпіўшы ня разьбярэш, у чым справа!

Вам, браткі сяляне, я радзіў-бы, або злажыць „чалабітную“ і прасіць улады, каб Станаўкевіча замянілі кім іншым, або ўсім кінуцца на яго лекцыі, чытаць больш ягонай фабрыкацыі газэты, кніжкі, каб як небудзь вывучыць выдуманую „спадаром“ мову, а то іначай што-ж? Прыедзе да вас з Варшавы пасьля Станаўкевічаўскай адукацыі такі „пастыр“ і як ты, чалавеча, з ім згаворышся? Ты да яго дарагі, ён табе „дрыжоны“, ты яму пяць зал., а ён ад цябе пяцьдзесят закроіць — ані як ня дойдзеце да ладу, так можа і застацца твая душанька, як тая блудная авечка, бяз „пастыровай“ апекі, ды, чаго добрага, у пекла яшчэ лучыць, у смале будзе кіпець, ня дай божа! Лепш ужо дзень і ноч чытаць Станаўкевічаў „Народ“ і вучыцца на памяць яго „дзівосы і сямяхоты“. У пяць разоў лягей, браткі, далібог лягей і лягчэй, толькі да сну вельмі клоніць дый трэба ўжо заўчасу купіць асьмак нюхальнай табакі, а рэшта глупства — стрываць можна!

Той-самы.

ацыяльнае вызваленьне за грошы заінтэрэсаваных і гэтым наноў была з'арганізавана ў Зах. Беларусі „Прасьвета“, быццам культурна-асьветнае таварыства, а запраўды рэакцыйна-палітычнае. Чаму гэта так, зараз убачым. Заложана яно было („по приказу начальства“) групкай кар'ерыстаў „тоже белорусоов“ на чале з расейскім манархістам (як і ўсе яны) А. Паўлюкевічам. На цёпленькія пасады з „приличными“ авансамі пагналіся і другія „тоже белорусы“ і здэмаралізаваная частка беларускай інтэлігенцыі, няўдзячныя вывёўшай іх ў людзі Бацькаўшчыне.

Работа пашла. Паўлюкевічаўцы, як „наятая“, пачалі баламуціць вёскі і, карыстаючыся нясьведамасьцяй некаторых сялян, ашукваць іх і закладаць там (праўда, на паперы) „Прасьвету“. А з сьведамымі беларускімі сялянамі „дабрадзеі“ рабілі так: або „абясшкоджвалі“ (ведама як), або змушалі пад пагрозай тэрору і іх „запісацца“, і ціха...

Але-ж „праўда ня скварка — з булкаю ня зьясі“, кажа паговорка, і ўсе сяляне, бышыя „запісанымі“ у „Прасьвету, адны раней, другія пазьней убачылі праўду Паўлюкевіча і яго „Прасьветы“ і пачалі выступаць з іх.

Каб ратаваць сітуацыю, „милостивые“ хлебадаўцы еапхнулі з „палітычнага даху сваей акцыі“ прагарэўшага Паўлюкевіча рукою „Дзядзькі Тодара“. Але нешта і ў Тодара ня йдзе лявей: „Прасьвета“ растае, „яко воск от лица огня“—ад пашырыўшайся сьведамасьці шырокіх працоўных гушчаў сваіх патрэбаў і правоў. І вось ад „Прасьветы“ хутка астанецца толькі ўспамін (ой, ня лёгкі!), бо-ж яна рассыпалася ўжо, можна сказаць, аканчальна, асабліва ва ўсей Навагрудчыне, што сьцьвярджае і сам „дзядзька“ ў 18 нумары „Грамадзяніна“. Там бышая Прасьвета або ліквідуецца „сама“ (як піша „дзядзька“), або пераходзіць у Т-ва Беларускай Школы.

Вось тут і крыецца „гвозд“ усей справы! Ужо працоўныя беларускія гушчы ня тыя, што былі яшчэ так нядаўна, толькі некалькі гадоў таму. Яны не чакаюць бяззмена, пакуль хто згоніць з іх бяду, ці яна сама зьлезе, але самі ўжо, бяз ніякай агітацыі, і „подбужэня“ (разумеецца „камуністычнай“ ці „грамадаўскай“) гоняць з свайго відавоку ворагаў іх вызвольнага руху, быццам кажучы ім: „злазьце, дурні, з даху і ня псуйце гонтаў“. Што-ж вы на гэта скажаце „дзядзькі“ Тодары, Янкі, Пранукі, цёткі „Міны“ і хаваючыяся за імі? Ці не анямееце вы з спалоху?

Беларускія пропаведзі. Беларуская делегацыя каталікоў з Жодзішак зьвярталася ў мінулым месяцы да каталіцкага арцыбіскупа ў Вільні Ялбжыкоўскага з дамаганьнем увядзеньня ў касьцёле ў Жодзішках казаньняў у беларускай мове.

Дывэрсыйная банда? „Кур'ер Чырвоны“ паведамляе, што на ўсходніх „Крэсах“, у раёне вёсак Чаpнякі, Пляты і Саркі, зьявілася дывэрсыйная банда, дакапаўшая ўжо рад грабяжоў і нападаў. Банда быццам пераходзіць з-за радавай граніцы на польскія абшары і пасьля нападу зноў вяртаецца туды-ж. Камандуе ею быццам нейкі Шынкарко і Голуб.

Камуністычныя адозвы. Прэса падае, што 2 г. месяца (у „міжнародны дзень моладзі“) былі раскіданы камуністычныя адозвы ў Пастаўскім і Вялейскім паветах, а найбольш у м-ку Глыбокім.

Цэлы вагон. Апошнімі днямі на жалезнадарожным шляху Падбродзьдзе—Гэдуцішкі зладзеі абакралі таварны цягнік — выкралі цэлы вагон мануфактуры.

Мануфактура належала да адной з лодзкіх фабрык.

Паліцыя вядзе сьледзтва, але пакуль што аб рэзультатах ня чутно. Відаць, тут на шчот беларусаў ня чутно...

На цьвічэньнях. У часе вайсковых цьвічэньняў у лагеры Лясной (над Баранавічамі) цяжка падстрэлены радавы 35 п. п. Коц і капраль рэзэрвы Ныгкель. Раненя памешчаны ў шпіталі ў Баранавіч.

Прэса адзначае, што такія выпадкі ў Лясной здараюцца часта, запытацца, каму патрэбны гэтыя ахвяры?

Яшчэ ахвяры. У часе цьвічэньня 26 палку ўланаў у Лясной над Баранавічамі пры запальваньні пораху пар. Базальчуку цяжка апаліла твар, галаву і рукі. Апечанага перавязьлі ў шпіталь у Баранавічах. Дактары ня маюць надзеі на паправу.

Выпусьцілі на волю. 3 ліпня г. г. выпушчана на волю Надзея Нікіфараўская, засуджаная Віленскім Акружным Судом у катаргу 25 года за антыпанствовую дзейнасьць у м-ку Глыбокім.

Выпушчаная знаходзіцца ў безнадзейным стане, бо ня можа стаяць на нагах.

З жыцьця Горадні.

✕ **Выпусьцілі на свабоду... але за грошы.** У канцы мінулага месяца з Горадзенскага вастрогу застаў зволынены за кауцыю ў 500 злотых да часу судовае расправы 16 гадовы хлапец Аляксей Анішчык, які прасядзеў у вадзіночцы каля 9 месяцаў. Абвінавачваюць вось гэтага хлапца за ўдзел у камуністычнай дэманстрацыі, што адбылася ў студзені с. г. пад Горадзенскім вастрогам і за прыналежнасьць да камуністычнага саюзу моладзі Заходняй Беларусі.

✕ **Перамога работнікаў.** Апошнімі днямі работнікі скуранай прамысловасьці, што працуюць у прадпрыемцаў загатоўшчыкаў, абгаварыўшы адну з сваіх балячак—дрэнныя аплаты за працу праз гаспадароў, у якіх яны працуюць, пастанавілі зьвярнуцца да іх з дамаганьнем падвышкі зарабковай платы на 40 проц. дзеля дарагоўлі. У выпадку, калі яны ня згодзяцца на выстаўленае трэбаваньне, дык расначаць забастоўку.

Але да забастоўкі не дайшло, бо гаспадары, убачыўшы цьвёрдае і нязломнае рашэньне работнікаў, згадзіліся на падвышку жаданых 40 проц.

✕ **З забастоўкі работнікаў спажывецкай прамысловасьці.** Ужо каля 2 месяцаў як цягнецца забастоўка работнікаў спажывецкай прамысловасьці, якія працавалі на паравым млыне Касоўскага. Прычыны, якія выклікалі гэтую забастоўку, мы ўжо падавалі ў № 5 „Доля Працы“. Дык гаспадар млына да гэтага часу яшчэ не згаджаецца на дамаганьне работнікаў, і дзеля бясьпечнасьці (каб чаго-колечы ня выйшла з боку бастуючых работнікаў) выпісаў з каманды паліцыі 2-х паліцыянтаў, якія пільнуюць парадку і якім ён плоціць за гэту вось службу кожнаму па 40 зл. у дзень.

Дык паглядзем, чым гэта ўсё кончыцца?

Хваля.

Чэсьць Табе, моладзь!

(Ярэмічы Стаўпецкага павету).

Прайшло ўжо паўтара гады, калі ў адным з куткоў нашай бацькаўшчыны моладзь клала на аўтар барацьбы за волю народу ўсе свае сілы. Адраджэньне да новага жыцьця заклікала старых і малых, усе шлі за гэтым поклічам, крышачы па дарозе ўсе перашкоды.

Ладзіліся спэктаклі-вечары, расла культурна асьветная праца.

Непадабалася нашым „дабрадзеям“ сьвядомасьць працоўных барацьбітаў, каторыя служылі прыкладам для іншых. У хуткім часе шмат каго лёс загнаў за зялезныя краты. Асталіся жаночыя сілы і пару хлапцоў.

І вось быццам напаў сон, быццам заснуў стары і малы, а разам малады дубняк. Заварушыліся поўпанкі і тыя, што ў шкуру чужацкую лезуць жыўцом: яны хацелі выкарыстаць гэты быццам сон.

Пачалі заманваць да сябе рознымі спосабамі моладзь, пачалі закладаць розныя „kółki“ і „strzelcy“ і т. д. Напрасна! Уваскрэсла асьветная праца, зноў зарадаваўся Нёман, каторы каціў свае воды дагэтуль у журбе, ён заварушыўся, забурлеў. Чаму? бо пачуў над сабой песьню змаганьня, вылятаўшую з маладых грудзей дзяўчат і хлапцоў, песьню родную, напамінаўшую аб вольнасьці. У гэтай магутнай песьні ён падслухаў, што ня трэба чакаць ад каго літасьці, а трэба зламаць з жалезнай воляй ўсе беды і несправядлівасьці, і ісьці да лепшай будучыні.

Вось і 19/VIII-28 год стараньнем некаторых асоб была адыграна „Общепонятная мова“ і „Пісаравы імяніны“. Ня глядзячы на тое, што некаторыя артысты-аматары выступалі першы раз на сцэну, яны выканалі ролі памастацку. Глядзельнікаў была поўная саля, пад канец ігры пасыпаліся на сцэну букеты прыгожых красак. Пасьля спэктаклю хор тутэйшых дзяўчат і хлапцоў пад кіраўніцтвам гр. Любы Пяцько прапяяў: „Не пагаснуць зоркі ў небе“ і некалькі яшчэ народных песень. Мушу адзначаць пра сумнае зьявішча. У першых радох сядзела некалькі чалавек з тутэйшай беларускай інтэлігенцыі, і калі раздаліся гукі „Адвеку мы спалі“ большая частка ўстала, аднак яны пазволілі сабе сядзець, пакуль не раздаліся галасы абураных глядзельнікаў.

Ня буду пералічаць прозьвішчаў, але, што гэтая маладзь варта, якая не шануе свае мовы і роднай зямлі? Сум агарнуў чалавека, але, паглядзеўшы на сцэну і ўбачыўшы з якім натхненьнем пяялі артысты-аматары і якія абразы маляваліся на іхніх тварах—думка пранасілася маланкай да прароцтва нашага песьняра: „што будзе ўнукаў панаваньне там, дзе сяньня плача дзед“. Спэктакль-вечарына кончылася танцамі і глядзельнікі разыйшліся.

Ад імені працоўнага люду дзякую Вам, дарагія артысты і артысткі, што ня гледзячы не на якія перашкоды будзіце беларускі народ з цемры, служыце сьветачамі свабоды і праўды, а гэта Вам чесьць і слава!

В. Сумны.

„Kominiarze“.

(Гм. Каменка, Горадзенскага павету).

У канцы месяца жніўня зьявіліся ў нашу гміну „kominarzyki“. Рассыпаліся па цэлай гміне па двох, па трох, а дзе і адзін заблудзіў, абы толькі, вядома-ж, выцерці коміны з прыказу п. Старасты, як яны гаварылі.

Дзеля таго, што палілася ў печах, дык сяляне хацелі ня пусьціць, але солтыс пачаў казаць, што, хто ня пусьціць выціраць, на таго будзе напісаны пратакол, пасьля можа прыйдзецца заплаціць 5 зл. Каму вытра і не заплаціць адразу, то цераз гміну зыщчуць заўтра. Усе гэтаму і паверылі ды яшчэ казаў, што ён мае права выціраць, а дакуманты, кажа, зацьверджаныя Старастою, радаю гміннай і войтам і, што ніхто ня мае права забараніць, хаця-бы і хату спаліў.

Да праўды сьмешнае выціраньне! дым валіць з коміна, а ён стаіць на коміне і трэ яго. Сажы панасыпаў не адной бабе ў гаршкі, але да солтыса дайшоўшы, яму ня выціраў коміна, а перайшоў у наступную хату. За гадзіну перайшоў нашую вёску і, узяўшы нешта злотаў каля 15, пашоў да другой вёскі. Ці-ж гэта не пазаходняму, мае вы браткі?!

Чуткі.

З Радавае Беларусі.

Тэатр, мастацтва і музыка.

Музтэхнікум выканаў значную працу ў справе тварэньня беларускай оперы. Падрыхтаваны ўжо да пастаноўкі: „Сывільскі цырульнік“, „Русалка“ і „Евгений Онегин“—адрыўкі оперы Чайкоўскага „Чаравікі“, некалькі адрыўкаў з оперы „Барыс Гадуноў“ і інш.

Апрача гэтага, рыхтуецца чыста беларуская адна-актная опэра „Тарас на Парнасе“. Музыку для яе піша кампазытар Аладаў.

Таксама Наркомасьветы Беларусі заказаў маскоўскаму кампазытару напісаць лібрэта для новай беларускай опэры „Сымон Музыка“ Якуба Коласа.

— У Віцебску пры мастацкім тэхнікуме з'арганізавалася аб'яднаньне маладых беларускіх мастакоў, налічваючае 11 сталых сяброў—супрацоўнікаў, 8 кандыдатаў. Аб'яднаньне ставіць мэтай вывучэньне быту сялян і работнікаў Беларусі, а таксама беларускага мастацтва.

— Пры Белар. Дзяржаўным Музэі адкрыта саля, у якой выстаўлены скульптура і карціны з II-ое ўсебеларускае выстаўкі.

— Б.Д.Т. 2 вядзе перагаворы з аўтарам вядомай п'есы: „Рэйкі гудуць“ — пісьменьнікам Кіршанам, аб пастаноўцы яго п'есы ў Б. Д. Т. 2.

Апрача перакладных, тэатр рыхтуецца паставіць некалькі арыгінальных беларускіх п'ес. Частка іх ужо набыта ад аўтараў, а частка яшчэ апрацоўваецца.

З тае прычыны, што на беларускай сцэне яшчэ ня было ні воднай пастаноўкі для дзяцей — тэатр уключае ў сваю вытворчую праграму і дзіцячыя п'есы.

Для вывучэньня беларускага народнага мастацтва Беларускі Мастацкі Тэхнікум з'арганізаваў сёлета экспэдыцыю па навучэньні беларускага народнага мастацтва: орнаманту, разьбярства і інш. Экспэдыцыя наведвае самыя глухія куткі Радавай Беларусі, якія поўнасьцю захавалі сваю старажытную народную мастацкую творчасьць.

У Белдзяржмузэі з 16 красавіка адкрыта выстаўка краязнаўчых фатаграфіяў і зарысовак. Выстаўка займае 5 вялікіх пакояў, дзе зьмяшчаюцца сшыткі з экспанатамі розных фатаграфічных здымкаў і зарысовак.

На выстаўцы прадстаўлена жыцьцё ўсяе этнографічнай Беларусі, пачынаючы з павярхоўя Волгі, Зах. Дзьвіны, Дняпра і канчаючы Прыпецкім Палесьсем і Надбужанскім Падлесьсем.

Хроніка друку.

Беларускі драматург **Ул. Галубок** здаў для друкаваньня Беларускаму Дзярж. Выдавецтву новую п'есу для сялянскага тэатру — „Белы вянок“.

— Увосень бягучага году літэратурнае аб'яднаньне „Маладняк“ зьбіраецца выдаць агульны зборнік-альманах.

Апроч гэтага з восені „Маладняк“ будзе выдаваць літэратурную газэту.

— Белар. Дзярж. Выдавецтвам друкуюцца новыя зборнікі апавяданьняў „Людзі-суседзі“ Крапівы і „Салавей“ Зьмітр. Бядулі.

— Перавыдаецца Белдзярвыдавецтвам другім выданьнем зборнік апавяданьняў „На зломе“ Янкі Нёманскага.

— Вышаў з выданьня Віцебскага Краязнаўчага Т-ва зборнік „Віцебшчына“, зьмяшчаючы шмат матэр'ялаў аб статыстычна-эканамічным стане акругі.

— Белдзярж выдавецтва друкуе другім выданьнем зборнік апавяданьняў Якуба Коласа „На прасторах жыцьця“, „У ціхай вадзе“ і „Казкі жыцьця“.

КАРЭСПАНДЭНЦЫ.

Самавольная канфіската газэт.

(М-ка Ляхавічы, Баранавіцкага пав.).

Дарагія чытачы! Вы, мусіць, яшчэ ня ведаеце, дзе дзяюцца нашыя газэты! Вось я вам раскажу. Адзін мой сябра папрасіў мяне, каб я яму прынёс з пошты газэты. Прыходжу я на пошту ды пытаю ў нейкага паніча, ці прыйшлі нам газэты?

— Якія?—пытае.

— „Доля Працы“—кажу.

— Idźcie do cholery! Takich niema!

А я не спалохаўся ды зірнуў на паліцу, дзе кладуць газэты, ажно бачу газэты, дзе вялікімі, чорнымі літарамі напісана: „Доля Працы“. Уздыхнуў я цяжка і, хоцькі — ня-хоцькі, паплёўся да хаты, бо каб дамагаўся свайго, дык гэты панок паклікаў-бы „wkrótce“ паліцыю і зараз „protokół“ за нарушэньне „spokoju“.

Дык вось, як урадоўцы спаўняюць свой „obowiązek służbowy“.

Цікавы.

Ад рэдакцыі. Баяцца пратаколу ў такім выпадку ня трэба, бо ён беспадстаўны. Кожны падпішчык нашай газэты мае поўнае права дамагацца на пошце выдачы яе, а, калі гэтае права нарушаецца,—трэба аб гэтым зараз-жа паведамляць рэдакцыю, паведаміўшы разам і сьведак, бачыўшых падобны выпадак.

„Wiwat“ „Заходняя Культура“.

(Новы-Пагост, Браслаўскага пав.).

Не на жарт „нашы апякуны“ засыпалі „дзікія“ Усходнія Крэсы асаднікамі і рознымі „культурнікамі“, бо запраўды-ж цёмнаму чалавеку шмат чаго можна ад іх „навучыцца“. Адзін з такіх культурнікаў, прыехаў ажно з самай караннай Польшчы (з Паможа)—Кавальскі, жывець у хвальв. Лясное, Нова-Пагосткай вол., і надта „мастацка“ рэалізуець узложаную на яго місію. Любімым сваім тэрэнам ён выбраў нашае мястэчка, дзе ходзіць напіўшыся ды бушуець. Некалькі тыдняў назад ён гнаўся на рынку за адным жыдам, крычаўшы пры гэтым, што трэба хоць аднаго жыда „пацапаць“, бо ён ужо больш 8 гадоў ня „меў з імі сутычнасьці“, але жыду ўдалося ўцячы. Аднак, гэта яшчэ ня ўсё. У вёсцы Храпоўшчыне, некалькі вёрст ад Лясной, жывець адна бедная, беззямельная сялянка, Ганна Мароз, з сваімі малымі дзяцьмі. Муж яе—Сымон—ужо больш як ½ года пашоў у Старую Вялейку на работу і ня толькі ня прыслаў ніводнага граша,—але і сам прапаў бяз весткі. Гаротнай бабе ня было ніякага больш выхаду, як аддаць сваю старэйшую дзяўчынку (13 г.) дзенебудзь служыць, што і зрабіла, аддаўшы яе да Кавальскага. Цяжка было матцы быць адной з дзяцьмі, ды ня вельмі лёгка было і яе дачцы бегаць босай па халоднай расе за панскімі кароўкамі тады, як мілыя дзеткі асадніка яшчэ соладка спалі. Але думалася: „вось пагаруе, а на зімку чаго небудзь прызаробіць“. Ды сталася інакш. Хутка дачушка, заплакаўшыся, прышла дамоў з растрэпанымі лапцямі без заплаты, бо пасьля пяцімесячнай службы панок яе прагнаў, як „нягодную“. Калі маці прыйшла да яго са сьлязамі прасіць хоць маленькай заплаты, бо дзеткі пухнуць з галадухі, — „культурнік“ адказаў, што і так ён робіць гуманаа, бо ён мог бы перадаць гэта ў „рэнцэ справедлівасьці“, дзе ён маець шмат калегаў і панібратаў, дык хоць Ганна і вясковая баба, аднак зразумела, што дабра ад гэтай кампаніі бачыць ня прыйшлося-б. І вось бедная кабеціна, заплакаўшы, з пустымі рукамі вярнулася ў сваю хату.

Дык вось, якія плады—„Заходняй Цывілізацыі“!

Горкі.

З апошніх дзён.

(В. Азіраўцы, Браслаўскага пав.).

Апошнія дні прынясьлі нам нябывалую сэнсацыю.

30 жніўня 1 і 2 верасьня г. г. ў м. Браслаўі, адбылося „Wielkie święto wychowania fizycznego i przysposobienia wojskowego“. Мэта гэтага „święta“, як відаць, была — пасеяць трошкі туману паміж „мужыкамі“ і крыцягнуць працоўную моладзь у „strzelcy“.

Аднак, неяк разьбіліся ўсе панскія надзеі, бо „chamy“, як яны называюць сялян, ня толькі не запісаліся ў розныя „стшэльцы“, але палічылі непатрэбным навет прыйсьці паслухаць іх „pięknych słów“.

Ня думайце, аднак, паважаныя чытачы, што нашыя сяляне гультаі. Не!

Бо ў 1926 г., калі праняслыся чуткі, што ў той-жа Браслаў прыедуць на мітынг беларускія пасолы, дык сялян зьявілася ў Браслаў некалькі тысячаў.

Сярмяжнік.

Ці Вы прыдбалі хоць аднаго платнага падпішчыка для нашай газэты?

Чытайце і пашырайце сваю сялянска-работніцкую газэту.

Сяляне і работнікі!

Памятайце, што кожнае слова Вашае газэты Вас усьведамляе, а кожны Ваш грош запэўняе ей існаваньне.

Рэдактар-Выдавец: М. Масьцерко.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.